В. В. Пранічнікаў

# КАРАЛЬ ЧАПСКІ: ГРАФ З ПІЎНОЙ ЭТЫКЕТКІ

У гісторыі ёсць магчымасць для самавыказвання людзей, якія не былі царамі, палкаводцамі, вядомымі вучонамі, але якія сваёй актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, ініцыятывай, адказнасцю, бескарыснай стваральнай працай аставілі след у гісторыі. Адной з такіх асоб у гісторыі Мінска з'яўляецца граф Карл Эмерыкавіч Чапскі, які з 1890 г. па 1901 г. займаў пасаду галавы Мінска. Графа лічаць аматарам піва, яго выява змешчана на этыкетцы піва "Граф Чапскі", ён – былы гаспадар завода "Багемія", які выпускаў піва, і які цяпер мае назву "Аліварыя". І зусім нямногія ведаюць пра яго, як выдатнага кіраўніка нашага горада ў канцы XIX ст. Род Чапскіх вядомы яшчэ з часоў Вялікага княства Літоўскага. Эмерык Захарый Мікалай Гутэн–Чапскі быў з ліку вядомых царскіх вяльможаў. Займаў пасады Ноўгарадскага губернатара, Пецярбургскага віцэ-губернатара і дырэктара Лясного дэпартамента Расіі. Сядзіба рода Гутэн-Чапскіх знаходзілася ў Станькаве (40 км ад Мінска). Тут 15 жніўня 1860 г. нарадзіўся Караль Ян Аляксандр Гутэн–Чапскі. Караль Чапскі уваходзіў у лік самых багатых жыхароў Мінска. Валодаў 10-цццю самымі лепшымі ў горадзе будынкамі. У 1890 г. у 30-гадовым узросце ён выбіраецца на пасаду гарадскога галавы г. Мінска. Трэба адзначыць, што на гэту пасаду ен абіраўся тройчы: у 1890 г., 1893 г., 1897 г. За час кіраўніцтва горадам К. Чапскі здейсніў цэлы шэраг мерапрыемстваў. Сярод іх можна адзначыць наступныя: будаўніцтва новага гарадскога тэатра ў 1890 г., увядзенне электрычнага асвятлення ў 1894 г., наладжванне тэлефоннай сувязі, адкрыцце Мінскай гарадской бойні для жывёлы, ламбарда і крам, конна-чыгуначнай дарогі, рамесных і прыходскіх школ, гімназій, рэканструкцыя гарадскага водаправода, адкрыцце дома прытулку і санітарнага камітэта, крэдытнага таварыства, будаўніцтва мастоў, брукаванне вуліц. Такім чынам, калі падвесці вынік дзейнасці Караля Чапскага на пасадзе галавы горада на працягу трох тэрмінаў, то бачна, што яго энергічнасць, ініцыятыва закранала ўсе сферы жыцця Мінска. Дзейнасць Чапскага не абмяжоўвалася толькі гарадскімі справамі. Ён быў выдатным эканамістам і прадпрымальнікам. Адзін з вядомых аспектаў яго дзейнасці – гэта піваварства. Э. Чапскі выкупіў піваварны завод мяшчан Фрумкіных, а К. Чапскі ўзвёў мураваны будынак новага завода, які захаваўся да нашых дзён. Зараз у гэтым будынку – піваварны завод "Аліварыя". Граф ператварыў завод у буйное акцыянернае таварыства "Багемія". У Станькаве К. Чапскі наладзіў узорную для таго часу гаспадарку. Меў завод па вырабу спірту, завод керамічных вырабаў. Разводзіў пародзістых кароў і быкоў, коней і сабак. Меў аранжарэі, цяпліцы, пітомнікі. Караль Чапскі памёр у ноч з 17 на 18 студзеня 1904 г. ад туберкулёзу на 44-ым годзе жыцця. Газета "Голос провинции" пісала ў 1906 г.: "Паслужы граф яшчэ пару гадоў – і Мінск стаў бы Парыжам". І для такога сцверджання былі пэўныя падставы. Пры ім за адно дзесяцігоддзе Мінск з правінцыяльнага губернскага гарадка зрабіўся сапраўдным сучасным еўрапейскім горадам.

### *Спіс літаратуры*


1. Валахановіч, А. І. Графы фон Гутэн –Чапскія на Беларусі. – Мн., 2003.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі фонд.1, воп.1, спр.2553, спр.2417, спр.2489, спр.2835, спр.2916.
3. Шыбека, З. У. Мінск. Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада. – Мн., 1990.


*Пранічнікаў Віталій Валер'евіч*, студэнт факультэта радыётэхнікі і электронікі Беларускага дзяржайнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, VitalyPran@mail.ru.
*Навуковы кіраўнік: Сугака Натальья Анатольевна*, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Sugako@bsuir.by.